# БРАЦКАЯ МАГІЛА
# (СМАЛЯВІЦКІ РАЁН, АГ. ЮР’ЕВА)



**Шыфр гісторыка-культурнай каштоўнасці (паводле дзяржаўнаму спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь): 613Д000590**

**Месцазнаходжанне:** Смалявіцкі раён, аграгарадок Юр'ева, вул. Маладзёжная

**Каардынаты:** 54.165389, 28.073314

**Кароткае апісанне:**

Брацкая магіла (1941–1944 гг.) ў аг. Юр'ева Смалявіцкага раёна – помнік гісторыі. У 1967 г. на магіле пастаўлен помнік – скульптура воіна з аўтаматам. Пахавана 213 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну ў баях супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў.

**Апісанне:**

Брацкая магіла (1941–1944 гг.) ў в. Юр'ева Смалявіцкага раёна – помнік гісторыі (**613Д000590**), які ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

У аграгарадку Юр'ева, ля самай дарогі, якая вядзе на суткі, размешчаны парк, у якім знаходзіцца брацкая магіла. У 1957 годзе на брацкай магіле пастаўлен помнік-скульптура воіна ў салдацкай шынялі і плашч-палатцы з аўтаматам у руках. На пастаменце помніка замацаваныя металічныя шыльды з імёнамі загінулых.

Паабапал помніка-скульптуры размешчаны 2 памятных знака. Першы, размешчаны справа ад помніка, выканан ў форме, якая нагадвае кулямёт. На другом, які размешчан з процілеглага боку, намалявана пяціканцовая зорка і нанесены наступны тэкст: "Тут у гады нямецка-фашысцкай акупацыі грунтаваўся і кіраваў баявымі аперацыямі штаб партызанскай брыгады "Смерць фашызму"".

У брацкай магіле захаваны 213 чалавек: воіны Чырвонай Арміі і партызаны, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Сярод пахаваных – партызаны брыгады “Смерць фашызму”.

Брыгада “Смерць фашызму” створана ў ліпені 1943 года. У чэрвені 1942 года па рашэнні ЦК КП(б)б у савецкім тыле сфарміраваны партызанскі атрад “Смерць фашызму” і накіраваны ў Смалявіцкі раён. Да лістапада 1942 года атрад дзейнічаў самастойна, затым увайшоў у брыгаду “Старык”, з мая 1943 года – зноў асобны.

Партызаны брыгады наносілі ўдары па варожых камунікацыях на чыгуначнай лініі Мінск-Барысаў, на шашэйных і грунтавых дарогах. Удзельнічалі ў “рэйкавай вайне”.

Партызаны брыгады “Смерць фашызму” здзейснілі больш за 100 буйных дыверсій, узарвалі каля 780 аўтамашын, 470 рэек, разбурылі 1,5 кіламетра чыгункі, збілі 2 і пашкодзілі 5 самалётаў, узарвалі і спалілі 55 мастоў, 4 склада і іншае.

Брыгада дзейнічала ў Смалявіцкім, Плешчаніцкім, Лагойскім, Барысаўскім раёнах. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 2 ліпеня 1944 года ў складзе 4 атрадаў агульнай колькасцю 706 чалавек.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://gosspisok.gov.by/?AspxAutoDetectCookieSupport=1. – Дата доступа: 20.12.2022.

2. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць. Кніга 2 / АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэдкал.: С. В. Марцэлеў [і інш]. – Мн. : БелСЭ, 1987. – 308 с.

5. Памяць : Смалявіцкі раён. Жодзіна : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / [уклад.: Ю. Я. Гіндзін, Г. У. Разумаў ; рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск : БЕЛТА, 2000. – 768 с.